Найважнейшым цэнтрам Асветы на Беларусі пачынаючы з XVI ст. быў Віленскі універсітэт. Але ў перыяд Асветы яго значэнне мае асаблівы характар: элементы дэмакратызацыі навукі, як і ўвогуле ведаў, садзейнічалі абуджэнню "краявога патрыятызму", які выявіўся ў навуковых працах выкладчыкаў — мастакоў універсітэта.

У асяроддзі эпохі Асветы заканамерным стала і адкрыццё пры Віленскім універсітэце кафедры мастацтва ў XVIII ст., якая ў літаратуры атрымала назву Віленскай мастацкай школы, куды прымалі асабліва здольных, нягледзячы на іх сацыяльнае паходжанне.

У творах выяўленчага мастацтва таго часу мастак звяртаецца да свецкіх сюжэтаў. З'яўляецца вялікая цікавасць да гістарычнай тэматыкі (І. Рапалеўскі). Характэрнай адзнакай часу стала развіццё партрэтнага жанру (К.Гескі).

Эпоха Асветы — гэта скарб еднасці жыцця, светапогляду, псіхалогіі, характару, мовы, вывучэнне і адкрыццё якога неабходныя для нас і нашчадкаў у справе адраджэння і ўзвышэння Беларусі.

Машанава А.І.,
аспірантка кафедры
беларускай і сусветнай
мастацкай культуры

## МАЙСТЭРСТВА ПУБЛІЧНАГА ВЫСТУПЛЕННЯ

У нямоўных вышэйшых навучальных установах нашай рэспублікі, на жаль, не прынята вывучаць асновы моўных зносін уласна мастацтва прамоўцы. Гэта вядзе да нізкай моўнай культуры на ўсіх узроўнях бытавых і афіцыйна-дзелавых адносін, тады як у замежнай сістэме адукацыі рыторыцы надаецца значна больш увагі. Вывучэнне моўнай камунікацыі не толькі ўключана ў навучальныя планы, але і ўлічваецца ў пазааўдыторнай рабоце. У прыватнасці, рэгулярна праводзяцца конкурсы па мастацтве прамоўцы.



Репозиторий БГУКИ

У гэтым плане падаецца цікавым лёс Дэйла Карнэгі. Нарадзіўся і вырас ён у сям'і беднага фермера са штата Місуры. У час навучання ў педагагічным каледжы Карнэгі саромеўся сваёй беднасці, свайго цеснага паліто, задужа кароткіх штаноў. У яго развіўся комплекс непаўнацэннасці, але крыўдлівы і горды 16-гадовы юнак марыў вызначыцца з шасцісот студэнтаў каледжа.

Найбольшымі ўвагай і прэстыжам у студэнцкім асяроддзі карысталіся футбалісты, бейсбалісты і... пераможцы конкурсаў прамоўніцкага мастацтва. У яго не было даных дзеля таго, каб вылучыцца ў спорце, і ён вырашае выйграць спаборніцтва ў красамоўстве. Карнэгі апантаны ў дасягненні мэты. Па дарозе ў каледж і назад, на ферму, ён прадумваў будучыя свае выступленні. А потым, забраўшыся на кучу сена ў адрыне, з вялікім пафасам, жэстыкулюючы, гаварыў перад перапужанымі галубамі прамову аб неабходнасці спыніць японскую іміграцыю.

У выніку вялікіх намаганняў, накіраваных на пераадоленне пачуцця ўласнай непаўнацэннасці, Карнэгі ўдалося заваяваць вышэйшыя ўзнагароды за публічныя выступленні. Ён прыйшоў да высновы аб тым, што здольнасць данесці думку да аўдыторыі, якая складаецца з аднаго слухача ці з соцень людзей, умацоўвае ў чалавеку ўпэўненасць у сабе. Пры гэтым Дэйлу Карнэгі стала відавочным, што, маючы такую ўпэўненасць, ён зможа дасягнуць усяго, чаго зажадае, і што гэта даступна і іншым. Менавіта гэтай думкай прасякнута яго кніга "Як выпрацаваць упэўненасць у сабе і ўплываць на людзей, выступаючы публічна".

Мастацтва прамоўцы заключаецца ў здольнасці вылучыць прыёмы красамоўства і моўнай тактыкі, прааналізаваць іх слушнасць і ўзнавіць ва ўласнай прамове. Эфектыўнасць прамовы выступоўцы вызначаецца дасканаласцю засвоеных ім моўных навыкаў.

Майстэрства вуснай маналагічнай мовы прыходзіць з вопытам. Некаторыя маладыя прамоўцы адчуваюць сябе

скавана і нават баяцца публічнага выступлення. Не маючы дастатковага вопыту выступленняў, яны нярэдка недаацэньваюць свае магчымасці, не валодаюць моўнымі прыёмамі. Вось некаторыя прычыны, якія выклікаюць скаванасць прамоўцы:

*Празмернае паглыбленне ва ўласныя перажыванні.* Дзеля таго каб выключыць ці аслабіць гэтую перашкоду, спецыялісты рэкамендуюць сканцэнтраваць увагу на змесце прамовы, унушаючы сабе пры гэтым: “Пазіцыя, якую я прадстаўляю, значна важней за маю асобу”. Але для гэтага, як мінімум, неабходна мець дакладную, прадуманую пазіцыю.

*Недаацэнка ўласных магчымасцей.* Неабходна прымусіць сябе паверыць, што падрыхтаванасць да выступлення выдатная, матэрыял, сабраны па тэме, вельмі інфарматыўны і павінен зрабіць на слухача патрэбнае ўражанне.

Адной з прычын, па якіх людзі аказваюцца незразуметымі, з’яўляецца тое, што самі яны недастаткова ясна ведаюць, што ж жадаюць выказаць. Таму старанная падрыхтоўка да выступлення, якое мае адбыцца, дазволіць паверыць ва ўласныя магчымасці.

*Недахоп вопыту.* Процідзеянне тут адно: назапашванне вопыту. Трэба часцей выступаць на семінарах, прымаць удзел у дыскусіях на розныя тэмы, асабліва ў коле сяброў.

*Памылковая ацэнка слухача.* Некаторыя маладыя прамоўцы схільныя бачыць у любых негатыўных паводзінах аўдыторыі прадузятыя адносіны да сябе. Часам гэта сапраўды так, але ў большасці выпадкаў аўдыторыя настроена ў адносінах да прамоўцы, асабліва нявопытнага, нейтральна ці добразычліва. Таму неабходна прывучыць сябе ў першую чаргу бачыць у слухачах не зламысных цэнзараў, а партнёраў.

*Успаміны аб правале.* Трэба пагадзіцца з думкай, што адно з выступленняў сапраўды можа аказацца няўдалым (дарэчы, нават з вопытным прамоўцам можа здарыцца няўдача, не кажучы ўжо аб тым, што далёка не кожнае



Репозиторий БГУКИ

выступленне прыносіць задавальненне). Перадоленне вынікаў няўдач з'яўляецца грунтоўнай часткай працэсу станаўлення маладога прамоўцы. Пры гэтым словазлучэнне “малады прамоўца” не азначае ўзросту, а найперш мае на ўвазе вопыт.

Ні адзін прамоўца не застрахаваны ад няўдач, але вопытнага прамоўцу вылучае хуткая і дакладная рэакцыя на розныя нечаканасці ў працэсе прамовы.

Напрыклад, выступоўца страціў нітку свайго выступлення, абарваў яе на паўслове і не ведае, што гаварыць далей. Што робіць у такім выпадку прамоўца-прафесіянал? Сабраўшыся з духам, паўтарае апошнюю выказаную ім думку, а потым гаворыць: ”Я хачу яшчэ раз падкрэсліць...”

Яшчэ адзін прыклад: прамоўца абмовіўся. Як тут дзейнічаць? Калі з-за агаворкі скажаецца сэнс выказвання, неабходна адразу ж паправіць сябе.

У заключэнне некалькі парад, якія прыводзяць Б. і Х. Швальбе ў кнізе “Асоба, кар'ера, поспех”.

1. Настройце сябе на аўдыторыю.

2. Найперш высветліце, ці адпавядае змест вашай прамовы інтарэсам гледачоў. Калі вашы інтарэсы разыходзяцца з іх інтарэсамі, то паспрабуйце навесці масты ўзаемаразумення.

3. Трымайцеся ў час выступлення ўпэўнена, дэманструючы цвёрдую перакананасць у сваіх словах.

4. Ваш позірк павінен быць накіраваны на слухачоў. Ні ў якім разе не пазбягайце позіркаў, накіраваных на вас. Не глядзіце ў адну кропку. Перш чым пачаць выступленне, абвядзіце позіркам аўдыторыю, нібыта жадаеце ўпэўніцца ў тым, што яна гатовая да ўспрымання вашых слоў.

5. Не пачынайце гаварыць, пакуль не ўсталявалася цішыня.

6. Пачынайце прамову з кароткага звароту да аўдыторыі.

7. З першых слоў уважліва сачыце за рэакцыяй аўдыторыі.

8. Сачыце за дакладнасцю мовы, не гаварыце вельмі хутка і ні ў якім разе не гаварыце манатонна.



Репозиторий БГУКИ

9. Калі вы заўважылі, што частка аўдыторыі менш уважліва слухае вас, звярніце позірк у яе бок, нібы звяртаецеся менавіта да яе.

10. Калі вы заўважылі, што аўдыторыя стамілася, пачніце гаварыць цішэй, а затым рэзка загаварыце гучней, але не настолькі, каб аўдыторыя адчула, што вы жадаеце падбадзёрыць яе.

11. Калі вы заўважылі, што словы, толькі што сказаныя вамі, знайшлі падтрымку аўдыторыі, то пастарайцеся неадкладна развіць закранутую тэму.

12. У момант душэўнага ўздыму, выкліканага адабрэннем аўдыторыі, не страчвайце ўсё ж самакантролю.

13. Правакацыйныя рэплікі таксама не павінны выводзіць вас з раўнавагі.

14. У крытычныя моманты выступлення неабходна гаварыць пераканана, упэўнена, з актуалізацыяй кожнага слова.

15. Ні ў якім разе не паказвайце, што прамова даецца вам з цяжкасцямі, што вы стаміліся ці адчуваеце сябе няўпэўнена.

16. Скончыўшы выступленне, не забывайце падзякаваць прысутным за ўвагу.

Ніколі не дазваляйце, нават тады, калі спакуса вельмі вялікая, ушаноўваць сябе пасля выступлення і ўлагоджваць сваё самалюбства несціханымі воплескамі.

**Тоўкач І.,**
магістр

## ТВОРЧАСЦЬ КАМПАЗІТАРАЎ БЕЛАРУСІ Ў ГАЛІНЕ НАРОДНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЙ МУЗЫКІ

У 20-я гады на Беларусі зарадзілася новая галіна кампазітарскай творчасці — музыка для народных інструментаў, ансамбляў і аркестраў.

Падставай для стварэння гэтай галіны творчасці было з'яўленне першых выканальніцкіх калектываў. Менавіта



Репозиторий БГУКИ